УДК 316.75(476)

# ПАРАДЫГМАЛЬНЫ АСПЕКТ РАЗВІЦЦЯ НАВУКОВЫХ ВЕДАЎ АБ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЕ

***В. М. Сакалова,***
*кандыдат культуралогіі, дацэнт, начальнік рэдакцыйнага аддзела, дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Разглядаюцца праблемы фарміравання парадыгмы ў працэсе развіцця навуковых ведаў аб нематэрыяльнай культурнай спадчыне ад факта яе існавання да тэарэтычнага асэнсавання і інстытуалізацыі. Прасочваецца генезіс феномена нематэрыяльнай культурнай спадчыны з пункту гледжання станаўлення тэрміналогіі, замацавання паняцця ў міжнародным інстытуцыйна-прававым дыскурсе, а таксама аналізуецца яго выкарыстанне ў нарматыўнай прававой практыцы Рэспублікі Беларусь.

**Ключевые слова:** навуковая парадыгма, нематэрыяльная культурная спадчына, заканадаўства, інстытуалізацыя, Рэспубліка Беларусь.

# PARADIGMAL ASPECT OF THE DEVELOPMENT OF SCIENTIFIC KNOWLEDGE ABOUT INTANGIBLE CULTURAL HERITAGE

***V. Sakalova,***
*PhD in Culturology, Associate Professor, Head of the Editorial Department, Associate Professor of the Department of Cultural Studies of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article examines the problems of paradigm formation in the process of developing scientific knowledge about intangible cultural heritage from the fact of its existence to theoretical conceptualization and institutionalization. The author traces the genesis of the phenomenon of intangible cultural heritage from the point of view of the formation of terminology, consolidation of the concept in the international institutional

and legal discourse, and also analyzes its use in the normative legal practice of the Republic of Belarus.
**Keywords:** scientific paradigm, intangible cultural heritage, legislation, institutionalization, Republic of Belarus.

Навуковая парадыгма, якая пазначаецца, паводле Т. Куна, як сукупнасць навуковых дасягненняў, што прапануюць навуковай супольнасці «мадэль пастаноўкі праблем і іх рашэнняў»[1] [8, с. 11], выконвае нарматыўную функцыю, забяспечваючы замацаванне, сістэматычнасць і ўстойлівасць, гэта значыць фундаментальны характар навуковай тэорыі.

Культурная парадыгма, якая разглядаецца як сэнсавае адзінства рухомых элементаў культуры ў іх стылявой сінхроннасці [2, с. 10], забяспечвае гістарычную пераемнасць культуры.

У культуралогіі парадыгма вызначаецца як мадэль грамадскіх паводзін, «культурны механізм матывацыі, заснаваны на захаванні ў агульным карыстанні характэрных для дадзенай культуры мадэляў або узораў рашэнняў інтэлектуальных або практычных задач» [10].

Зыходзячы з дадзеных асноўных характарыстык, разгледзім фарміраванне парадыгмы навуковых ведаў пра нематэрыяльную культурную спадчыну.

Генезіс тэрміна нематэрыяльнай культурнай спадчыны цесна звязаны з усведамленнем культурнай каштоўнасці спадчыны ў цэлым. Паняцце «культурная спадчына» з’яўляецца ў 1690 г., пачынае актыўна ўжывацца падчас Французскай рэвалюцыі, што было звязана з разбурэннем помнікаў культуры [11, с. 59]. У першай палове XIX ст. у шэрагу еўрапейскіх краін (Данія, Францыя, Бельгія і інш.) ствараюцца нацыянальныя сістэмы аховы помнікаў гісторыі і культуры.

У канцы XIX – пачатку XX ст. распрацоўваецца паняцце аб сусветнай спадчыне. Так, у пачатку XX ст. каштоўнасць спадчыны атрымлівае навуковае абгрунтаванне ў тэарэтычных распрацоўках прадстаўнікоў венскай школы гісторыі мастацтва А. Рыгля и М. Дворжака [15; 16], якія паўплывалі на станаўленне сістэмы аховы помнікаў у Цэнтральнай Еўропе.

Пасля Першай сусветнай вайны распрацоўваюцца пытанні аб міжнароднай сістэме аховы спадчыны. Як рэакцыя на вынікі Другой сусветнай вайны ЮНЕСКА прынята Канвенцыя аб абароне куль-

[1] Тут і далей пераклад цытат аўтара.

турных каштоўнасцей у выпадку ўзброенага канфлікту (Гаага, 1954), якая кіравалася прынцыпамі абароны культурных каштоўнасцей у выпадку ўзброенага канфлікту, усталяваных у Гаагскіх Канвенцыях 1899 г. і 1907 г. і ў Вашынгтонскім Пакце 1935 г. [5].

У гэтых дакументах размова ідзе аб матэрыяльных культурных каштоўнасцях.

Праблемы захавання спадчыны ў сілу аб'ектыўных сацыяльна-эканамічных прычын актуалізаваны і ў мірны час і знайшлі практычнае ўвасабленне ў праектах ЮНЕСКА па выратаванні помнікаў старажытнаегіпецкай цывілізацыі ў сувязі з будаўніцтвам Асуанскага гідравузла (1959), захаванні Венецыі і Венецыянскай лагуны (1987) і інш.

У выніку дзейнасці міжнароднай супольнасці была прынята Канвенцыя аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны (1972), у якой вызначаўся парадак стварэння Спіса сусветнай спадчыны і ўключэння ў яго каштоўнасцей культурнай або прыроднай спадчыны [6].

З сярэдзіны 1950-х гг. паняцце спадчыны становіцца значна шырэй, уключае таксама фальклорную, навуковую, індустрыяльную спадчыну [11, с. 61]. Падпарадкоўваючыся агульным заканамернасцям развіцця, пад уплывам глабалізацыйных працэсаў, якія адбываюцца таксама сярод паняццяў, з'яўляецца тэрмін «нематэрыяльная спадчына». Спадчына, якая вызначалася раней на падставе заходняй канцэпцыі як «перадача маёмасці», набывае новае значэнне, заснаванае на ідэі: «каб перадача была эфектыўнай, яна павінна ажыццяўляцца самімі носьбітамі, з чаго ўзнікла паняцце “жывыя скарбы чалавецтва”» [Там же].

Прызнанне неабходнасці захавання «жывой культуры», асабліва звязанай з рызыкай страты вусных традыцый, зафіксавана ў Рэкамендацыі ЮНЕСКА аб захаванні фальклору (1989) [13]. Значэнне захавання разнастайнасці форм культуры, каштоўнасцей, традыцый і вераванняў падкрэсліваецца ва Усеагульнай дэкларацыі ЮНЕСКА аб культурнай разнастайнасці (2001) [3]. Усведамленне цеснай узаемасувязі паміж нематэрыяльнай культурнай спадчынай і матэрыяльнай культурнай і прыроднай спадчынай прасочваецца ў Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (2003), у якой упершыню даецца вызначэнне паняцця «нематэрыяльная культурная спадчына» [7]. На заканадаўчым узроўні ажыццяўляюцца фармалізацыя і структурызацыя інстытута спадчыны. Праблемы навуковага асэнсавання і фіксацыі аўтэнтычных праяўленняў традыцыйнай народнай культуры, распрацоўкі

тэзаўруса актыўна даследуюцца ў канцы XX – пачатку XXI ст. і асабліва востра паўстаюць у цяперашні час, пра што сведчаць шматлікія публікацыі, міжнародныя форумы, семінары, канферэнцыі (напрыклад: [9; 14]).

Такім чынам, нематэрыяльная культурная спадчына ўспрымаецца не толькі як аб’ектыўна існуючая з’ява, але і тэарэтычнае паняцце, навуковая канцэпцыя са сваёй структурай тэорыі, асноўнымі паняццямі, метадалагічным абсталяваннем.

Праблемы развіцця тэорыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў беларускай культурнай практыцы звязаны з разыходжаннем паняццяў. У заканадаўстве Рэспублікі Беларусь (Закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» 1992 г., Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г.) выкарыстоўваецца азначэнне «духоўныя каштоўнасці» [12]; у новай рэдакцыі Закона (ад 9 студзеня 2006 г.) у адпаведнасці з Канвенцыяй ЮНЕСКА аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (2003) уключана паняцце «нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці», вызначаны іх асноўныя катэгорыі, зафіксаваны спосабы іх выяўлення, крытэрыі адбору і прынцыпы аховы [1]. У Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб культуры (уступіў у сілу 3 лютага 2017 г.) замацавана паняцце «нематэрыяльная культурная каштоўнасць» (арт. 35, 66, 69, 70, 86), пры гэтым выкарыстоўваецца паняцце «нематэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць» у дачыненні да тых каштоўнасцей, якім на падставе пэўных крытэрыяў надаецца статус гісторыка-культурнай каштоўнасці (арт. 90–96) [4]. З 1993 г. фарміруецца Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, у якім да ратыфікацыі (2004) і ўступлення ў сілу Канвенцыі ЮНЕСКА (2006) духоўныя помнікі (геральдычныя выявы, тапонімы) адносіліся да матэрыяльных каштоўнасцей; на бягучы момант у Спісе яны, як і абрады, звычаі, урачыстасці, традыцыі, веды, навыкі і інш., вызначаны як нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці.

Акрамя тэрміналагічнай базы, актуальным праблемным полем застаюцца пытанні распрацоўкі фундаментальнай тэорыі, метадалогіі вывучэння нематэрыяльнай культурнай спадчыны (выяўлення крытэрыяў атрыбуцыі і класіфікацыі, стандарту навуковага апісання і г. д.), вызначэння норм і правіл інстытуалізацыі, а таксама ўзнаўлення, з прычыны цэласнасці, зменлівасці і «рухомасці» культурных з’яў.

*1.* Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс] : Закон Рэсп. Беларусь, 9 студз. 2006 г., № 98-З // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Рэжым доступу: https://etalonline.by/document/?regnum=H10600098. – Дата доступу: 06.04.2024.

*2. Бакач, Н. Б.* Культурная парадигма как объект социально-философского анализа : дис. … канд. филос. наук : 09.00.11 / Н. Б. Бакач. – Волгоград, 1998. – 136 л.

*3.* Всеобщая декларация ЮНЕСКО о культурном разнообразии [Электронны рэсурс] // Декларации ООН. – Режым доступу: https://www.un.org/ru/documents/decl_conv/declarations/cultural_diversity.shtml. – Дата доступу: 06.04.2024.

*4.* Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры [Электронны рэсурс] : 20 ліп. 2016 г., № 413-З : прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г. : адобр. Саветам Рэсп. 30 чэрв. 2016 г. : у рэд. Закона Рэсп. Беларусь ад 21 ліп. 2022 г. // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Рэжым доступу: https://etalonline.by/document/?regnum=hk1600413. – Дата доступу: 07.04.2024.

*5.* Конвенция о защите культурных ценностей в случае вооруженного конфликта [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.un.org/ru/documents/decl_conv/conventions/pdf/hague54.pdf. – Дата доступу: 06.04.2024.

*6.* Конвенция об охране всемирного культурного и природного наследия [Электронны рэсурс] // Конвенции и соглашения ООН. – Режым доступу: https://www.un.org/ru/documents/decl_conv/conventions/heritage.shtml. – Дата доступу: 06.04.2024.

*7.* Конвенция ЮНЕСКО об охране нематериального культурного наследия [Электронны рэсурс] // Конвенции и соглашения ООН. – Режым доступу: https://www.un.org/ru/documents/decl_conv/conventions/cultural_heritage_conv.shtml. – Дата доступу: 06.04.2024.

*8. Кун, Т. С.* Структура научных революций / Т. С. Кун ; пер. с англ. И. З. Налетова. – М. : Прогресс, 1975. – 288 с. – (Логика и методология науки).

*9. Купцова, И. А.* Нематериальное культурное наследие: концептуальные подходы к определению феномена / И. А. Купцова, В. А. Сазонова // Обсерватория культуры. – 2022. – Т. 19, № 1. – С. 56–64.

*10. Найдорф, М. И.* Парадигмы в культуре [Электронны рэсурс] / М. И. Найдорф // Введение в теорию культуры. Основные понятия в культурологии. – Одесса, 2005. – Режым доступу: https://sites.google.com/site/marknaydorftexts/main_notions/glava-3. – Дата доступу: 06.04.2024.

*11.* Наследие // Ключевые понятия музеологии : пер. с фр. / сост. А. Девалье, Ф. Мересс. – М., 2012. – С. 59–64.

*12.* Об охране историко-культурного наследия [Электронны рэсурс] : Закон Респ. Беларусь от 13 нояб. 1992 г. № 1940-XII // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ.

Респ. Беларусь. – Рэжым доступу: https://etalonline.by/document/?regnum=v19201940. – Дата доступу: 07.04.2024.

*13.* Рекомендация о сохранении фольклора [Электронны рэсурс] // Электронный фонд правовых и нормативно-технических документов. – Режым доступу: https://docs.cntd.ru/document/902084650. – Дата доступу: 06.04.2024.

*14.* Сохранение нематериального историко-культурного наследия стран СНГ в контексте глобальных вызовов : Междунар. науч.-практ. семинар, Минск, 15–17 нояб. 2022 г. : сб. науч. ст. / М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, Межгосудар. фонд гуманитарного сотрудничества государств – участников СНГ ; редкол.: Н. В. Карчевская [и др.]. – Минск : БГУКИ, 2022. – 440 с.

*15. Riegl, A.* Der Moderne Denkmalkultus: Sein Wesen und seine Entstehung / A. Riegl. – Wien ; Leipzig : W. Braumüller, 1903. – 145 S.

*16. Dvořák, M.* Katechismus der Denkmalpflege / M. Dvořák. – Wien : J. Bard, 1916. – 140 S.